Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедрай | Дэкан факультэта |
| __________ Д.В. Герасімёнак | __________ Ю.М. Галкоўская |
| «___» _____________ 2020 г. | «___» _____________ 2020 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02
Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Складальнік:
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства,
кандыдат гістарычных навук А.А. Трусаў

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта
22.12.2020 пратакол № 3

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Электронны вучэбна-метадычны комплекс складзены на аснове тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны рэг. № Е23-2-002/ пр-тып. ад 21.03.2019 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

**А.А. Трусаў**, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**

**Я.Л. Іванова**, намеснік дырэктара па лічбавым тэхналогіям і сувязях з грамадскасцю дзяржаўнай ўстановы «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь», кандыдат культуралогіі;

**А.В. Пазнякоў**, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № __ ад _____.2020 г.);

Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № __ ад _____.2020 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**


| | |
|---|---|
| 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА | 3 |
| 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 8 |
| 2.1 План-канспект лекцый | 8 |
| 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 12 |
| 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў | 12 |
| 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ | 12 |
| 4.1 Заданні да самастойнай работы магістрантаў | 12 |
| 4.2 Пытанні да экзамену | 14 |
| 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ | 15 |
| 5.1 Тэматычны план | 15 |
| 5.2 Асноўная літаратура | 16 |
| 5.3 Дадатковая літаратура | 18 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гісторыя беларускай рэстаўрацыі налічвае некалькі стагоддзяў і за гэты час адносіны да помнікаў беларускага дойлідства неаднаразова мяняліся. Першыя спробы кансервацыі і захавання помнікаў некаторых унікальных помнікаў архітэктуры сягаюць у канец XIX-пачатак XX ст. Пасля 1921 г., калі Беларусь была падзелена паміж Расіяй і Польшчай, у заходняй Беларусі плённа працавалі польскія кансерватары, а на тэрыторыі БССР пасля кароткага перыяда беларусізацыі пачалося шматгадовае змаганне з рэлігіяй і масавае знішчэнне ці перабудова архітэктурных аб’ектаў. Зараз у незалежнай Беларусі аднаўляюцца некаторыя шэдэўры архітэктуры і праблема кансервацыі і рэстаўрацыі набываюць важнае значэнне.

Вучэбна–метадычны комплекс “Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры” прызначаны для магістрантаў па спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” ( па напрамках ).

Вывучэнне курса дапаможа ім ў падрыхтоўцы да ўмоў работы ў сучасным музеі, у тым ліку рэгіянальным, а таксама пад час правядзення тэматычных экскурсій.

Вызначальнай мэтай выкладання дысцыпліны з’яўляецца вывучэнне магістрантамі сучаснага стану і перспектыў кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх помнікаў архітэктуры і музейных артэфактаў.

Адпаведна азначанай мэце пастаўлены наступныя *задачы,* якія павінны быць вырашаны ў працэсе вывучэння курса:

- прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю станаўлення і развіцця беларускай рэстаўрацыі;
- вызначыць уплыў сацыяльна-эканамічнага, унутрыпалітычнага і культурнага развіцця на сучасны стан помнікаў беларускага дойлідства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- засвоіць агульныя тэарэтычныя палажэнні сучасных інфармацыйных і музейных тэхналогій у сферы кансервацыі і рэстаўрацыі і прымяненні іх у сучаснай музейнай дзейнасці;
- азнаёміць з новымі рэстаўрацыйнымі тэхналогіямі і магчымасцю іх ужывання ў дзейнасці рэспубліканскіх і рэгіянальных музеяў;
- вывучыць вопыт выкарыстання рэстаўрацыйных тэхналогій у розных відах музейнай дзейнасці;
- азнаёміць з вопытам укаранення новых тэхналогій ў замежнай і айчыннай рэстаўрацыйнай прасторы..

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі ОСВО 1-23 01 12- 2013 вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны:

Акадэмічныя кампетэнцыі:

– АК-2. Метадалагічныя веды і даследчыя ўменні, якія забяспечваюць вырашэнне задач навукова-даследчай, навукова-педагагічнай, кіраўнічай і інавацыйнай дзейнасці.

Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:

– СЛК-6. Лагічна, аргументавана і ясна будаваць пісьмовую і вусную размову, выкарыстоўваць навыкі публічнай размовы, вядзення дыскусіі і палемікі.

Прафесійныя кампетэнцыі:

– ПК-4. Умець арганізоўваць правядзенне рэстаўрацыйных і кансервацыйных работ, фармуляваць задачы па праектаванню, эксплуатацыі і ўдасканаленню (ў частцы інфармацыйнага забеспячэння) стацыянарных музейных экспазіцый, выстаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ПК-9. Аналізаваць сучасны стан і перспектывы развіцця Дзяржаўнага музейнага фонда.

У выніку засваення курса магістранты павінны *ведаць:*

- асноўныя этапы гісторыі рэстаўрацыі ў XIX-XX ст.;
- сучасны стан беларускай рэстаўрацыі;
- асноўныя накірункі і дасягненні ў дзейнасці беларускіх рэстаўратараў на сучасным этапе;
- ролю адноўленых помнікаў гісторыі і культуры ў развіцці культуры краіны;
- спецыфіку ўжывання сучасных рэстаўрацыйных тэхналогій ў музейнай дзейнасці;
- асноўныя паняцці ў галіне кансервацыі і рэстаўрацыі, якія выкарыстоўваюцца ў музейнай дзейнасці.

Магістранты павінны *ўмець:*

- арыентавацца ў тэарэтычным матэрыяле;
- выкарыстоўваць асноўныя паняцці, тэрміны, фактычны матэрыял і атрыманыя навыкі ў музейнай дзейнасці;
- даць характарытыку беларускім помнікам беларускага дойлідства, якія патрабуюць аднаўлення;
- аналізаваць гісторыю стварэння і вопыт, кансервацыі і рэстаўрацыі музейных артэфактаў;
- вызначаць месца і ролю асноўных помнікаў архітэктуры ў культурным жыцці асобных рэгіёнаў;
- выкарыстоўваць атрыманыя веды ў галіне інфармацыйных тэхналогій для рашэння задач, якія звязаны з захаваннем і выкарыстаннем культурнай спадчыны і музейнай дзейнасцю.
- Вучэбна–метадычны комплекс “Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры” распрацаваны з улікам пастаўленых задач, узгоднены з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтам (“Археалогія”, “Гісторыя архітэктуры”, “Гістарычнае краязнаўства” і інш.).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры” прадугледжана 108 гадзін, з іх 46 аўдыторных (26 – лекцыйных, 20 – семінарскіх), форма кантролю ведаў – экзамен.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(для завочнага навучання)

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|
| | Лекцыі | **Семінарскія заняткі** | |
| Уводзіны. Прадмет і змест курса.Асноўная рэстаўрацыйная тэрміналогія. | 1 | | Выбарачнае апытанне |
| Тэма 1.Сістэма крытэрыяў каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. | 1 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| **Раздзел I. Гісторыя еўрапейскай рэстаўрацыі** | | | |
| Тэма 2. Рэстаўрацыя помнікаў Еўропы XIX – пачатку XX стст. Фармаванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі | 2 | | Выбарачнае апытанне тэставае заданне, пісьмовая работа |
| Тэма 3. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР | 2 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| Тэма 4. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў | 2 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| **Раздзел II. Гісторыя беларускай рэстаўрацыі і аховы помнікаў** | | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэма 5. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Мінска.<br><br>Тэма 6. Рэстаўрацыя Верхняга горада Мінска. | | 2<br><br>2 | |
| **Усяго:** | **8** | **4** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 2.1 План-канспект лекцый

*Тэма 1. Уводзіны*

Віды работ на матэрыяльных каштоўнасцях: нагляд, рамонт, натурныя даследаванні, кансервацыя, рэстаўрацыя, рэгенерацыя, рэканструкцыя, аднаўленне, прыстасаванне, раскрыццё.

Асноўныя крытэрыі каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры ў СССР: гістарычная каштоўнасць, горадабудаўнічая каштоўнасць, архітэктурна-эстэтычная каштоўнасць, эмацыйна-мастацкая каштоўнасць, навукова-рэстаўрацыйная каштоўнасць, функцыянальная каштоўнасць. Класіфікацыя каштоўнасцей у Рэспубліцы Беларусь.Крытэрыі адбору каштоўнасцей. Механізм уключэння музейных аб’ектаў і экспанатаў у дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Зберажэнне і аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцей. Кодекс аб культуры і яго роля ў рэстаўрацыі гістарычных помнікаў.

**Раздзел I. Гісторыя еўрапейскай рэстаўрацыі.**

***Тэма 2*. Рэстаўрацыя помнікаў Еўропы XIX—пачатку XX стст.**

**Фармаванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі**.

Першая спроба захавання помнікаў гісторыі і культуры ў Старажытных Грэцыі і Рыме. Эдыкт Майорыана і ўказ караля Тэадорыха Вялікага (VI

ст.н.э.). Буллы рымскіх папаў Паўла ІІ і Сікста IV (XV ст.). Рэстаўрацыя аббатства Сен Мексен у Францыі (кан. XVII ст.). Указы Пятра І аб ахове і захаванні помнікаў гісторыі ў Расіі.

Дэкрэты Нацыянальнага Канвента Францыі (кан. XVIII ст.). Адкрыццё музея ў Луўры. Музей гісторыі архітэктуры Ленуара (1791 г.).

Спробы рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры ў эпоху рамантызма. Англія, Германія, Францыя. Віктор Гюго і яго раман “Сабор Парыжскай Божай Маці”.

Дзейнасць І.М.Карамзіна ў Расіі. Стварэнне Генеральнай інспекцыі аховы помнікаў у Францыі (1830 г.) і яе дзейнасць. Рэстаўрацыя Маскоўскага Крамля і лёс Кітай-горада ў Маскве.

Эпоха стылістычных рэканструкцый. Віалле ле Дзюк – заснавальнік школы французскіх рэстаўратараў. Рэстаўрацыя сабора “Парыжскай Божай Маці”. Аднаўленне замкаў у Каркассоне і П’ерфоне. Рэстаўрацыя сабора ў Руане архітэктарам Алавуанам.

## ***Тэма 3*. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР і БССР**

Нацыяналізацыя помнікаў гісторыі і культуры пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Дэкрэт СНК ад 5 кастрычніка 1918 г. Стварэнне Расійскай акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры (1919 г.).

Рэстаўрацыя помнікаў Масквы: Крэмль, сабор Пакрова на Рву, Кітай-горад, палаты князя Галіцына, Казанскі сабор на Краснай плошчы. Заканадаўства БССР ў галіне аховы помнікаў гісторыі і архітэктуры.

Стварэнне дзяржаўных рэстаўрацыйных майстэрань. Ігар Грабар – тэарэтык савецкай рэстаўрацыі. Пётр Бараноўскі і яго рэстаўрацыйная дзейнасць.  Дзейнасць Міколы Шчакаціхіна і Івана Хозерава. Рэстаўрацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

помнікаў Сярэдняй Азіі. Закрыццё рэстаўрацыйных майстэрань. Сталінскія рэпрэсіі. Масавае знішчэнне культавых помнікаў архітэктуры. Страты СССР і БССР у галіне гісторыка-культурнай спадчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Дзейнасць Камісіі па ахове і аднаўленні помнікаў мастацтва. Стварэнне Спецыяльных праектна-вытворчых рэстаўрацыйных майстэрняў у гістарычных гарадах СССР. Аднаўленне разбураных пад час вайны помнікаў Ленінграда і яго прыгарадаў. Рэстаўрацыя Пятніцкай царквы канца XII—пачатку XIII стст. у Чарнігаве. Аднаўленне помнікаў Ноўгарада і Пскова.

### *Тэма 4.* Праблема кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў (Мірскі, Крэўскі, Любчанскі, Несвіжскі, Навагрудскі, Лідскі замкі і Стары Замак у Гародне)

Архітэктурна-археалагічнае вывучэнне Мірскага замка. Праблемы яго аднаўлення і прыстасавання. Рэстаўрацыя замка ў 20—30 гадах XX ст. Наданне помніку статуса помніка сусветнай спадчыны. Лёс Мірскай капліцы пачатку XX ст. і касцёла ў Міры. Сучасны стан замка ў Міры

Гісторыя будаўніцтва і рэстаўрацыі палаца-паркавага ансамбля ў Нясвіжы. Дзейнасць Антона Радзівіла і яго жонкі. Адбудова Нясвіжскай ратушы. Сучасны стан Нясвіжскага замка.

Трагічны лёс Крэўскага замка ў Першую Сусветную вайну. Кансервацыя польскіх спецыялістаў. Археалагічнае вывучэнне і спроба кансервацыі ў канцы XX ст. Рух моладзі ў абарону Крэўскага замка. Аднаўленне Крэўскага замка ў апошнія гады.

Замак-кастэль у Лідзе. Гісторыя вывучэння. Рэстаўрацыя-рамонт у пачатку XX ст., дзейнасць польскіх кансерватараў. Праект касервацыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэстаўрацыі і прыстасавання Лідскага замка ў 80-х гадах XX ст. Сучасныя праблемы аднаўлення і прыстасавання.

### *Тэма 5.* Праблема кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Мінска.

Планіроўка сярэднявечнага Менска ў XV—XIX стст. Узнікненне Верхняга горада, Троіцкага і Ракаўскага прадмесцяў. Археалагічнае вывучэнне і знішчэнне Менскага замчышча. Кальварыйскі гісторыка-культурны комплекс. Рэгенерацыя Траецкага прадмесця. Вяртанне вернікам забраных храмаў і іх адбудова. Аднаўленне касцёлаў Святога Роха, Святых Сімона і Алены і цэркваў Пятра і Паўла і Святой Марыі Магдалены. Адбудова помнікаў савецкага перыяда. Лошыцкі парк і сядзіба. Праблемы іх рэканструкцыі і прыстасавання.

### *Тэма 6.* Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Верхняга горада Мінска.

Узнікненне Верхняга горада як архітэктурнага ансамбля у XVI—XVIII ст. Плошча Свабоды і яе забудова. Разбурэнне помнікаў архітэктуры і іх перабудова ў 30 і 50-60 гады XX ст. Знішчэнне забудовы вуліцы Нямігі і Мінскага замчышча. Праект поўнага знішчэння Верхняга горада ў 70-х гадах мінулага стагодзя. Змаганне беларускай інтэлегенцыі за яго захаванне і іх перамога.

Аднаўленне помнікаў Верхняга горада ў пачатку 90-х гадоў. XX стст. дзейнасць акцыянернага таварыства “Стары Менск”. Адбудова і прыстасаванне кляштара базіліянак, “Дома масонаў , “сядзібы Ваньковічаў”, гандлёвых радоў і Мінскай Ратушы. Праблема аднаўлення Свята-Духоўнай царквы XVII ст. Аднаўленне польскімі рэстаўратарамі былога езуіцкага касцёла XVIII ст. Рэканструкцыя жылой забудовы і знос асобных будынкаў (вуліцы Герцена, Гандлёвая, Рэвалюцыйная і Кірыла і Мефодзія).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

**Тэма №1. Праблема кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры г.Мінска**

1. Планіроўка Мінска ў XV – XIX стст.
2. Помнікі гісторыі і культуры Верхняга горада.
3. Помнікі гісторыі і культуры Троіцкага і Ракаўскага прыдмесцяў.
4. Археалагічнае вывучэнне і праблема кансервацыі Мінскага замчыща.

**Тэма №2. Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Верхняга горада Мінска.**

1. Верхні горад як архітэктурны ансамбль XVI – XIX стст.
2. Плошча свабоды і яе забудова.
3. Дзейнасць акцыянернага таварыства "Стары Менск".
4. Аднаўленне Мінскай ратушы .

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

### 4.1 Заданні да самастойнай работы магістрантаў

**Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання**

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання магістрантаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў магістрантаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы магістрантаў

Арганізацыя самастойнай работы магістрантаў прадугледжвае падрыхтоўку магістрантамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах курса, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўцы да заліку і інш.

Самастойная работа магістрантаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамену.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў

Арганізацыя вучэбнай работы магістрантаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых магістрантамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

- тэставыя заданні па асобных падраздзелах і дысцыпліне ў цэлым;
- пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– выступленні магістрантаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне экзамена.

## 4.2 . Пытанні да экзамену

1. Ахова і рэстаўрацыя помнікаў на тэрыторыі Беларусі ў XVI – пач. XX стст.

2. Рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры на тэрыторыі Еўропы ў XIX - XX стст.

3. Ахова помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі Беларусі ў XX ст. (пасля 1917 г.)

4. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР.

5. Рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры ў БССР і Рэспубліцы Беларусь.

6. Даследаванні помнікаў архітэктуры падчас рэстаўрацыі.

7. Асноўная рэстаўрацыйная тэрміналогія.

8. Асноўныя прынцыпы сучаснай рэстаўрацыі. Фарміраванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі.

9. Рэстаўрацыя і рэгенерацыя мемарыяльных садоў і паркаў.

10. Праблемы рэстаўрацыі Лідскага замка.

11. Праблемы рэстаўрацыі Мірскага замка.

12. Аднаўленне і захаванне помнікаў у Гродна.

13. Рэстаўрацыя і захаванне беларускіх замкаў.

14. Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Верхняга горада Мінска.

15. Праблема рэстаўрацыі і прыстасавання замка Радзівілаў у Нясвіжы.

16. Рэстаўрацыя і прыстасаванне гістарычных цэнтраў Віцебска і Магілёва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Тэматычны план

## Завочная форма навучання

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| | Уводзіны | 1 | | |
| 1. | Сістэма крітэрыяў каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры | 1 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 2. | Рэстаўрацыя помнікаў Еўропы XIX - пачатак XX стст. | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія |
| 3. | Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія |
| 4. | Праблема кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія |
| | **Разам:** | **8** | **4** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Асноўная літаратура

**Літаратура**

*Асноўная:*

1. *Алексеев*, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI – 30-я годы XX в. / Л.В. Алексеев. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 206 с.

2. *Багласаў*, С.Г. Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыі / С.Г. Басагласаў. // Помнікі старажытнай беларускай культуры. Новыя адкрыцці. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – С. 126 –132.

3. *Багласов*, С.Г. Верхний город Минска: проблемы реконструкции / С.Г. Багласов. // Строительство и архитектура Беларуси. – 1982. – № 2. – С. 24 – 27.

4. *Беларуская* кафля / А.А. Трусаў і інш.; Пад рэд. С.А. Мілючэнкава. – Мн.: Беларусь, 1989. – 150 с.

5. *Глiннiк*, В.В. Неабходнасць стратэгіі захавання архітэктурнай спадчыны Беларусі савецкага перыяду / В.В. Глiннiк. // Праблемы захавання архітэктурнай спадчыны савецкага перыяду. Каштоўнасці мінуўшчыны – 6. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. – Мн.: БелЭн, 1999. – С. 45 – 57.

6. *Исследование* и реставрация русских изразцовых печей XVII – XVIII веков / А.И. Немцова. // Методические рекомендации. – М. Наука: 1989. – 35 с.

7. *История* и теория реставрации памятников архитектуры // Сб. научн. трудов под ред. А.С. Щепкова. – М. Наука: 1986. – 98 с.

8. *Калнiн*, В.В. Мірскі замак. / В.В. Калнін. – Мн.: Беларусь, 2002. – 160с.

9. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры: (прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2016 г.: адобраны Саветам Рэспублікі 30 чэрвеня

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2016г.) : уступае ў сілу з 3 лютага 2017 года. – Мінск: Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2016 – 272с.

10. *Локотко*, А.И. Архитектурное наследие Беларуси. (развитие традиций, охраны и реставрация). / А.И. Локотко. – Мн.: ИООО «Право и экономика», 2004. – 303 с.

11. *Мартыненко*, И.Э. Законодательство об охране Историко-культурного наследия и прокурорский надзор за его исполнением. / И.Э. Мартыненко. – Мн.: Тесей, 2001. – 245 с.

12. *Михайловский*, Е.В. Реставрация памятников архитектуры. / Е.В. Михайловский. – М.: Наука, 1971. – 189 с.

13. *Памятники* всемирного наследия / Кисель В.П. и др. – Мн.: БелЭн, 1998. – 288 с.

14. *Подъяпольский*, С.С. и др. Реставрация памятников архитектуры. / С.С. Подъяпольский. – М.: Стройиздат, 1988. – 269 с.

15. *Подъяпольский*, С.С. Основы реставрации памятников архитектуры. / С.С. Подъяпольский. – М.: Стройиздат, 1983. – 270 с.

16. *Реставрация*, исследование и хранение музейных художественных ценностей. Выпуск 2. Технические средства освещения музеев и реставрационных мастерских. – М.: Наука, 1984. – 48 с.

17. *Рэстытуцыя* культурных каштоўнасцей. Праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты). – Мн.: БелЭн, 1997. – 257 с.

18. *Реставрация*, исследования и хранение музейных и художественных ценностей. Полевая консервация археологических находок в СССР и за рубежом. Выпуск 1. – М.: Наука, 1984 – 30 с.

19. *Слюнченко*, В.Г. Полоцкий Софийский собор. Историко-архитектурный очерк. / В.Г. Слюнченко. – Мн.: Полымя, 1987. – 240 с.

20. *Список* памятников истории и культуры республиканского значения Белорусской ССР. – Мн.: БелСЭ, 1990. – Кн. 1. – 273 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. *Страчаная* спадчына. – Мн.: Полымя, 1998. – 351 с.

22. *Трусаў, А.А*. Мінулае і сучаснасць Лідскага замка // Беларускі гістарычны часопіс, 2008. №6. С. 21-23.

23. *Трусаў Алег*. Беларускія кафляныя печы // Беларускі гістарычны часопіс. 2016, №5, С. 4-17.

24. *Трусаў Алег*. Эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі манументальнага дойлідства Беларусі XI-XVIII. Мінск. БДУКІМ, 2020- 306 с.:іл.

*5.3. Дадатковая літаратура:*

1. Агееў, А.Р., Трусаў, А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне / Аляксандр Агееў, Алег Трусаў. – 2-е выд., папр. І дап. – Магілёў: Магіл. Абл. Узбуйн. Друк. 2010-160с.

2. Венецыянская хартыя // Наша Ніва. – 1994. – № 8-9.

3. Выгонная, А.А., Калнін, В.В., Цейтліна, М.М. Основа реставрации памятников архитектуры, монументальной и станковой живописи. / А.А. Выгонная, В.В. Калнін, М.М. Цейтліна. – Мн.: Дизайнпро, 2000. – 96 с.

4. Никитин, М.К., Мельникова, Е.П. Химия в реставрации. / М.К. Никитин, Е.П. Мельникова. – Л.: Химия, 1990. – 304 с.

5. Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеіфікацыі. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, 4 чэрвеня 2005 г. г.п. Мір, Гродзенская вобл. / Нав. рэд. Н.Ф.Высоцкая. – Мінск: ТАА “Белпрынт”, 2006. – 192 с.

6. Семечкина, Е.В. Реставрация тканей. Методические рекомендации. / Е.В. Семечкина. – М.: Наука, 1990. – 65 с.

7. Трусаў А.А. Манументальные дойлідства Беларусі XI-XVIII стст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі. – Мн.: ТАА “Лекцыя”, 2001-204с.

8. Школа музейных кансерватараў. Бюлетэнь.- 2005- 2006.- 44с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ